## ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНАЙ ДОШКІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Новікава Таццяна Уладзіміраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
дзяржаўнай ўстановы адукацыі "Гімназія № 3 г. Магілёва";
бакалаўр педагагічных навук
(г. Магілёў, Беларусь)

Адзін з найбольш эфектыўных спосабаў зацікавіць вучняў сваім прадметам – выкарыстанне ў навучанні сродкаў, якія заслужана карыстаюцца папулярнасцю, дазваляюць вучню атрымаць дастаткова шырокае і яркае ўяўленне пра сучасны свет, пра ўзаемасувязь з'яў і прадметаў у ім. Пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры самым перспектыўным у гэтым плане аказалася выкарыстанне інфармацыйных камп'ютарных тэхналогій (ІКТ). ІКТ садзейнічаюць павышэнню матывацыі навучання, фарміраванню пазнавальнай цікавасці ў вучняў, умення параўноўваць, абагульняць, рабіць высновы [2]. Такі падыход да навучання запатрабаваны сучасным грамадствам [3].

Усё большую папулярнасць апошнім часам набірае такі электронны сродак навучання, як інтэрактыўная дошка. Яна адкрывае новыя магчымасці для адукацыйнага працэсу. У кастрычніку 2012 года сучаснай інтэрактыўнай дошкай быў абсталяваны кабінет беларускай мовы гімназіі № 3 г. Магілёва. Давялося перагледзець звыклыя падыходы да падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў, паколькі значны тэхнічны патэнцыял запатрабаваў вывучэння і метадычнага асэнсавання.

Работу інтэрактыўнай дошкі забяспечваюць наступныя праграмныя прадукты – "Elit Panaboard" і "Smart Notebook". Дарэчы, большай папулярнасцю карыстаецца апошняя праграма. У сеціве маюцца распрацоўкі ўрокаў беларускай мовы і літаратуры з выкарыстаннем "Smart Notebook 10".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Цікавы аспект першых крокаў па асваенні інтэрактыўнай дошкі – рэакцыя вучняў на з'яўленне новага тэхнічнага сродку ў кабінеце: непазбежная празмерная ўзрушанасць дзяцей, з якой настаўніку неабходна справіцца.

Напачатку электронная дошка выкарыстоўвалася пераважна як дэманстрацыйны сродак, яе ж інтэрактыўныя магчымасці адкрываліся нам з вучнямі паступова. Так, эфектыўнымі на ўроках мовы і літаратуры былі прэзентацыі "Power Point", якія ўтрымлівалі слайды з фрагментамі "сляпога" тэксту, незапоўненых або часткова запоўненых кластараў, а таксама тэксты "Microsoft Word", якія патрабавалі рэдагавання [5]. Прыклады такога выкарыстання інтэрактыўнай дошкі выкладзеныя намі ў публікацыі адкрытага ўрока беларускай літаратуры "Апавяданні Яна Баршчэўскага з кнігі "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (№ 10 за 2013 год часопіса "Беларуская мова і літаратура").

На ўроках мовы добрыя вынікі дае праца са "сляпым" тэкстам. Напрыклад, дзевяцікласнікі ахвотна працуюць з інтэрактыўнай дошкай у гэтым кірунку, рыхтуючыся да экзамену па беларускай мове. Практыкаванні складаем на аснове зборніка экзаменацыйных матэрыялаў. Дапамагае сканер і спецыяльныя камп'ютарныя праграмы, якія дазваляюць у далейшым апрацоўваць тэкст у звыклым рэдактары "Microsoft Word". Такія заданні (на ўстаўку літар і пастаноўку знакаў прыпынку) не патрабуюць ад настаўніка шмат часу на падрыхтоўку і ахвотна выконваюцца самастойна кожным вучнем. Практыкуем і такі падыход: адзін з дзевяцікласнікаў паралельна з класам працуе над тэкстам на камп'ютары, пасля пры дапамозе дошкі дэманструецца адрэдагаваны ім тэкст, калектыўна ўносяцца праўкі чырвоным колерам, памылкі разбіраюцца на дошцы. Многія вучні аддаюць перавагу набору тэксту на клавіятуры камп'ютара, а не традыцыйнаму запісу яго на дошцы ад рукі пад дыктоўку настаўніка. Да таго ж, такі прыём спрашчае наступную праверку запісанага, паколькі надрукаваны тэкст успрымаецца з інтэрактыўнай дошкі лепш. Магчымы розныя варыянты працы ў залежнасці ад мэт канкрэтнага ўрока, асаблівасцяў класа, індывідуальнага стылю работы настаўніка. На любым уроку роднай мовы дарэчнай аказваецца дэманстрацыя малюнкаў, што дазваляюць лепш засвоіць беларускую лексіку і робяць урок больш жывым і наглядным, уносячы эмацыянальную разгрузку.

Вучні ставяцца да работы з інтэрактыўнай дошкай па-рознаму ў залежнасці ад узросту і індывідуальных асаблівасцяў. Больш актыўна праяўляюць сябе пяцікласнікі, насцярожана і стрымана – старшакласнікі. Увогуле, дзецям патрабуецца менш часу, чым дарослым, на асваенне прыёмаў працы з новым электронным сродкам. Паступова ўсе вучні авалодваюць навыкамі працы з інтэрактыўнай дошкай. Важна праявіць цярплівасць і сачыць за тым, каб захоўваліся санітарна-гігіенічныя нормы выкарыстання ЭСН у навучальным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

працэсе. Гэта дазволіць пазбегнуць лішняй нервовай узрушанасці, зрабіць выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі больш эфектыўным [4].

Тэхнічныя магчымасці інтэрактыўнай дошкі вельмі шырокія. У дадатак да звыклых функцый камп'ютара можна маніпуляваць аб'ектамі на экране, маляваць і сціраць лініі, захоўваць створаныя аб'екты ў памяці камп'ютара для наступнага выкарыстання. Новыя магчымасці адкрываюцца ў працы па тэхналогіі шматмерных дыдактычных інструментаў. Логіка-сэнсавая схема можа ствараццa калектыўна, паэтапна на кожным уроку з вывучэннем новага аспекта тэмы, а затым дапамагаць у падагульненні і сістэматызацыі ведаў. Творчы падыход да падрыхтоўкі ўрокаў цяпер забяспечаны надзейным сучасным сродкам навучання. Інтэрактыўная дошка выкарыстоўваецца на любым этапе ўрока, але з улікам таго, што нагрузка на нервовую сістэму вучняў павінна разумна дазіравацца. Часцей плануецца работа з інтэрактыўнай дошкай на этапе кульмінацыі ўрока, такім чынам вучні заахвочваюцца да стараннай працы на яго папярэдніх этапах. Апраўдвае сябе выкарыстанне электроннай дошкі пры падагульненні вывучанага, на этапе рэфлексіі, паколькі можна аператыўна звярнуцца да найбольш важных аспектаў тэмы.

Далейшыя шляхі да пасяховага асваення інтэрактыўнай дошкі пралягаюць праз супрацоўніцтва з найбольш матываванымі вучнямі і ажыццяўляюцца на факультатыўных і стымулюючых занятках, калі ў распараджэнні настаўніка і вучняў больш часу. Практыкуецца складанне комплексных заданняў для адораных вучняў, якія выконваюцца кожным вучнем самастойна. Добрыя вынікі дае і выкарыстанне распрацаваных Нацыянальным інстытутам адукацыі электронных вучэбна-метадычныя комплексаў (ЭВМК) па беларускай мове і літаратуры [1]. Магчымасць працаваць з інтэрактыўнай дошкай успрымаецца вучнямі вельмі станоўча, дадаткова матывуе на вывучэнне беларускай мовы і літаратуры. Праўда, часам дзеці аддаюць перавагу самому працэсу, адыходзячы ад яго сутнасці. З такімі праявамі настаўніку даводзіцца змагацца.

У пазакласнай працы інтэрактыўная дошка таксама значна дапамагае. Акрамя таго, што яна з'яўляецца сучасным дэманстрацыйным сродкам, адкрываюцца неабмежаваныя магчымасці для стварэння і правядзення інтэрактыўных гульняў, конкурсаў. Паколькі пазакласныя мерапрыемствы набываюць прывабны для вучняў фармат, наведваюцца яны больш актыўна і з большай цікавасцю. Гэта садзейнічае росту рэйтынгу беларускай мовы і літаратуры як прадметаў.

Такім чынам, інтэрактыўная дошка – эфектыўны сучасны электронны сродак навучання, які дазваляе настаўніку больш творча падыходзіць да падрыхтоўкі і правядзення вучэбных заняткаў, паколькі дапамагае рэалізаваць тэхнічна любыя дыдактычныя ідэі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура


1. Инструктивно-методическое письмо “Об использовании современных информационных технологий в учреждениях общего среднего образования в 2015/2016 учебном году” [Электронный ресурс] / Министерство образования Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://adu.by/wp-content/uploads/2015/umodos/imp/imp-inform-tehnologii-oso-15-16.pdf. – Дата доступа: 05.02.2016.
2. Инструктивно-методическое письмо по использованию ИКТ и ЭСО в образовательном процессе [Электронный ресурс] / Министерство образования Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://edu.gov.by/main.aspx?guid=14451. – Дата доступа: 02.11.2015.
3. Концепция информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 года [Электронный ресурс] / Министерство образования Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://edu.gov.by/. – Дата доступа: 08.02.2016.
4. Санитарные нормы и правила «Требования при работе с видеодисплейными терминалами и электронно-вычислительными машинами»: пост. Министерства здравоохранения Респ. Беларусь, 28 июня 2013 г., № 59 [Электронный ресурс] / Национальный правовой Интернет-портал. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=W21327737p&p1=1. – Дата доступа: 15.02.2016.
5. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии – 2 / Н. И. Запрудский. – Минск : Сэр-Вит, 2010. – 256 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова